11. Традыцыйная мастацкая культура беларусаў: у 6 т. / В.І. Басько [і інш.]. – Мінск : Выш. шк., 2006. – Т. 3: Гродзенскае Панямонне. – 608 с.
12. Элиаде, М. Аспекты мнфа / М. Элиаде. – М. : Инвест-ППП, 1995. – 240 с.

*Марыя Бабчанок*

## АКАЗІЯНАЛЬНАЯ АБРАДНАСЦЬ У СІСТЭМЕ КОМПЛЕКСУ АБРАДАЎ БЕЛАРУСАЎ

Для гістарычнага развіцця чалавецтва характэрна тое, што вераванні, маральна-этычныя нормы, правілы, погляды, спосабы вядзення гаспадаркі, якія б забяспечвалі дабрабыт кожнага чалавека і грамадства ў цэлым, назапашваліся ў пэўную сістэму, фарміруючы сацыяльны вопыт, перадаваліся з пакалення ў пакаленне і ўсведамляліся як неабходныя на ўзроўні грамадскай свядомасці. Гэтая сістэма ўяўляла сабой сукупнасць дзеянняў, слоў, рухаў, магічных сімвалаў, знакавых элементаў, якія схематычна адлюстроўвалі вераванні чалавека і ажыццяўляліся паводле формульнага прынцыпу. Усё гэта на ўзроўні падсвядомага павінна было садзейнічаць дабрабыту чалавека, што абумоўлівала канстантнасць выканання і забяспечвала ўстойлівае захаванне і пераемнасць зместу, характару, форм пэўных працэсаў і з’яў асабістага і грамадскага жыцця.

Сістэма вызначаных форм паводзін і вераванняў чалавека, якая ўяўляе сабой формулу выканання сімвалічна-знакавых дзеянняў і тэкстаў, традыцыйнасць якой абумоўлівае месца правядзення, выбар выканаўцаў і атрыбутаў, а таксама накіравана на пэўны аб’ект, праводзіцца ва ўстаноўлены час і мае акрэсленае функцыянальнае значэнне, з’яўляецца абрадам.

У народнай традыцыі абрады з’яўляліся неабходным кампанентам жыцця, яны суправаджалі чалавека ва ўсіх сферах жыццядзейнасці і асэнсоўваліся як дзеянні, якія фактычна могуць стварыць падзею. Напрыклад, вяселле садзейнічала стварэнню новай сям’і, выкананне абрадавых дзеянняў Гукання вясны павінна было забяспечыць абуджэнне прыроды, разрыванне сланечніка па сімвалічнаму падабенству ўплывала на разыходжанне хмараў і г.д.

Абрадавы комплекс беларускага народа ўяўляе сабой сістэму абрадаў і звычаяў, рэгулюемых жыццём чалавека і ўвасобленых у яго светаўяўленні. Асновай жыццядзейнасці чалавека з’яўлялася аграрная гаспадарка, «вакол якой склалася разгалінаваная і зладжаная сістэма народных ведаў, працоўных навыкаў, звычаяў, абрадаў, духоўных светаўяўленняў, павер’яў, сімвалічных дзеянняў і інш.» [6, с. 3]. Вялікае значэнне мела захаванне і перадача ад пакалення да пакалення працоўных і бытавых ведаў, уменняў і навыкаў, а таксама звычаяў, абрадаў, сімволіка-знакавых дзеянняў, павер’яў, звязаных з асноўнымі жыццёвымі сферамі: сям’ёй, працай, узаемаадносінамі з іншымі членамі грамадства.

Сістэматызацыя беларускіх абрадаў, рытуалаў і звычаяў садзейнічае больш глыбокаму вывучэнню чалавечага вопыту, захаванага ў традыцыйнай культурнай спадчыне беларусаў.

Выдзяленне абрадавых тыпаў можа быць заснаванае на розных фактарах. Напрыклад, К. Чыстоў вызначае іх разнастайныя варыянты: эмпірычная форма магічных сродкаў і спосабаў, мэтанакіраванасць абрадавых дзеянняў, умовы выканання, склад і сацыяльны статус выканаўцаў абрадаў, час правядзення, спосаб арганізацыі абрадавай прасторы, характар сувязі разнастайных відаў абрадаў і г.д. [7, с. 103-105]. Рускі даследчык К. Логінаў звяртае ўвагу на магчымасць выдзялення тыпавых груп абрадаў у залежнасці ад складу выканаўцаў («асабістыя», «групавыя», «абшчынныя»), ад полу і ўзросту людзей («мужчынскія» і «жаночыя», «дзіцячыя», «падлеткавыя», «маладзёжныя» і г.д) [4].

Вызначэнне класіфікацыі беларускай абраднасці можа быць заснаванае на асаблівых прыкметах розных кампанентаў абрадаў і звычаяў, аднак найбольш фундаментальным з мэтай сістэматызацыі з’яўляецца выдзяленне абрадавых відаў па наступных аспектах.

1. Аб’ект абрадавага дзеяння – вызначэнне тыпу абраднасці знаходзіцца ў пэўнай залежнасці ад галоўнага аб’екта абраду, спецыфіка якога рэгулюе наяўнасць тых ці іншых абрадавых кампанентаў і звязана з асаблівасцямі функцыянальнай накіраванасці абраду ў цэлым. Аб’ект абраду ўяўляе сабой чалавека, жывую істоту, прыродную з’яву, прадмет і іншае, усё тое, на што накіравана абрадавае ўздзеянне (магічныя або сімвалічныя дзеянні, тэксты, выкарыстанне атрыбутаў і г.д.).

2. Час правядзення абраду – аднясенне абрадавых дзеянняў да пэўнага тыпу залежыць ад іх часавай прымеркаванасці. Абмежаванні часу правядзення абраду маюць вялікае значэнне для большасці беларускіх абрадаў, гэта адносіцца да вызначэння часу сутак (поўдзень, поўнач, раніца, вечар і г.д.), дзён тыдня, квадры месяца, пары года ці канкрэтнай каляндарнай даты, або звязана з наступленнем пэўнага жыццёвага этапу.

3. Функцыянальная накіраванасць – вызначэнне тыпу абраду цесна звязана з тымі функцыямі і мэтавымі ўстаноўкамі, якія ставяцца пры яго правядзенні. Абрадавы комплекс мае некалькі агульных функцый – «кансалідуючыя, камунікатыўныя, мабілізуючыя, магічныя, выхаваўчыя, мастацка-эстэтычныя» [5, с. 11]. Аднак кожны канкрэтны абрад, накіраваны на вырашэнне пэўных задач, мае асабістае прызначэнне ў народным жыцці, што вызначае спецыфіку яго правядзення. Падабенства функцый абрадавых сродкаў садзейнічае пераходу іх з аднаго абраду ў іншы. Прыкладам можа стаць ачышчэнне вадой у купальскіх абрадах, а таксама ў абрадах, накіраваных супраць засухі, і іншыя.

Такім чынам, сістэма беларускай абраднасці ўключае ў сабе наступныя групы абрадаў.

1. *Каляндарныя*, якія можна ўмоўна падзяліць на гаспадарча-бытавыя, магічна-інтымныя і спецыялізаваныя. Гаспадарча-бытавыя абрады звязаны з земляробчай і жывёлагадоўчай дзейнасцю селяніна і накіраваны на забеспячэнне першасных жыццёвых патрэб. Гэтыя абрады прымеркаваны да асноўных сельскагаспадарчых цыклаў сезонных прац і сканцэнтраваны ў святах усіх пор года. Магічна-інтымныя абрады ўяўляюць сабой сукупнасць рытуальных дзеянняў і тэкстаў, звязаных са сферай шлюбна-полавых адносін і выяўляюцца ў каляндарнай абраднасці. Спецыялізаваныя абрады ўключаюць рытуальныя дзеянні і тэксты, звязаныя з вузкапрафесійнымі, але не земляробчымі заняткамі, гэта абрады млынароў, кавалёў, пастухоў, пчаляроў і г.д. Выбар аб'екта абрадавых дзеянняў абумоўлены спецыфікай прафесіі, занятка, паспяховае выкананне якога з'яўляецца асноўнай задачай правядзення абраду.

2. *Сямейныя* – абрады, якія вызначаюць асноўныя жыццёвыя цыклы, звязаныя з пэўнай зменай сацыяльнага статуса ў традыцыйным грамадстве. Сямейныя абрады ўключаюць у сябе радзінную, вясельную, пахавальную і памінальную абраднасці.

Аднак сярод вышэйназваных груп можна асобна вылучыць абрады, якія адрозніваюцца спецыфічнымі асаблівасцямі. *Аказіянальныя* (лац. occasionalis – выпадковы) – гэта абрады, якія ўзнаўляюцца ў быце не рэгулярна, а толькі пры неабходнасці ці ўзнікненні асаблівых, часцей крытычных, крызісных акалічнасцяў. Аказіянальная абраднасць характарызуецца своеасаблівым часам выканання (па неабходнасці) і накіравана на магічнае ўздзеянне на прыродныя і «іншыя» сілы з мэтай змянення крытычнай або крызіснай сітуацыі ў жыцці чалавека.

Аб'ектам такіх абрадаў з'яўляюцца прыродныя сілы і стыхіі, якія з'явіліся прычынай узнікнення крызісу і звяртанне да якіх абумоўлена светаўяўленнем і магічнымі вераваннямі чалавека ў традыцыйным грамадстве. Рытуальныя дзеянні характарызуюцца рухомасцю, своеасаблівым характарам працякання абрадавага часу, залежным ад жыццёвых абставін, якія выклікалі правядзенне дадзеных абрадаў.

Спецыфікай выканання аказіянальнай абраднасці з'яўляецца тое, што чалавек не мог прадказаць і прадугледзець наступленне крытычнага моманту, што абумоўлівала наяўнасць прымхлівага страху перад ім. Гэты аспект выяўляе кансерватыўнасць і канстантнасць аказіянальнай абраднасці. Аказіянальныя абрады накіраваны на дасягненне станоўчага выніку пры змяненні крызісу, які спрыяў парушэнню жыццёвага рытму, і на ўмацаванне гарантыі ў немагчымасці далейшага ўзнікнення такіх сітуацый.

Магічны характар аказіянальнага абрадавага дзеяння падкрэсліваўся асаблівымі прыкметамі: паўторамі тэкстаў і дзеянняў, абмежаваннем полу і ўзросту выканаўцаў, здзяйсненнем руху па коле, па крыжы, наданнем незвычайных магчымасцяў атрыбутам абрадаў і іншымі. Абрадавымі сродкамі выступалі розныя матэрыяльныя рэчы, рытуальная ежа, вада, нават жывёлы і птушкі, якія выконвалі ў абрадзе сімвалічную аберагальную і ачышчальную ролю.

Аказіянальныя абрады з'яўляюцца даволі ўстойлівымі да зменаў. Аднак у ходзе свайго гістарычнага развіцця яны, як і іншыя віды беларускай абраднасці, удасканальваліся, узбагачаліся і змяняліся. Асабліва гэтыя працэсы характэрны пасля прыходу хрысціянства. Узбагачэнне абрадавых элементаў царкоўнымі атрыбутамі і тэкстамі садзейнічала далейшаму развіццю аказіянальнай абраднасці ў новых сацыяльных умовах. Сінтэз язычніцкага і хрысціянскага светаўяўленняў найбольш яскрава выявіўся ў аказіянальнай абраднасці.

Дадзеная класіфікацыя заснавана на тым аспекце, што абрады і звычаі пранізвалі ўсё жыццё чалавека і з'яўляліся неад'емнай часткай існавання чалавечага грамадства. Вядучыя накірункі абрадавай дзейнасці чалавека былі звязаны з забеспячэннем дабрабыту ў асноўных сферах жыццядзейнасці, якія датычацца працы, сямейных адносін, а таксама ўзнікнення крызісных сітуацый, якія змянялі створаны лад жыцця. Уключэнне аказіянальнай абраднасці як асобнай групы звязана з вызначэннем спецыфічных асаблівасцяў дадзенага тыпу. Аказіянальная абраднасць з'яўляецца найбольш архаічнай і ўтрымлівае ў сабе рэшткі старажытных вераванняў і ўяўленняў чалавека, якія маглі быць звязаны з усімі сферамі жыцця чалавека. Таму паміж аказіянальнымі абрадамі і іншымі відамі беларускай абрадавай культуры існуюць цесныя сувязі, што выяўляюцца ва ўзаемапранікненні і ўзаемадапаўненні рытуальных элементаў, тэкстаў і г.д.

**Спіс літаратуры:**


1. Бабчанок, М.А. Семантыка і змест аказіянальных абрадаў і звычаяў / М.А. Бабчанок // Весці БДПУ. – Мінск, 2006. – № 1. Серыя 2. – С. 119–121.
2. Байбурин, А.К. Ритуал в традиционной культуре / А.К. Байбурин. – Рос. АН, Музей антропологии и этнографии им. Петра Великого (Кунсткамера). – СПб.: Наука, 1993. – 240 с.
3. Лобач, У.А. Беларуская традыцыйная культура і хрысціянская царква ў 19 – пачатку 20 ст. // Народныя традыцыі і нацыянальная культура : Матэрыялы рэсп. навук.-практ. канф., Мінск, 6-7 снеж. 2001 г.: У 2 кн. / пад рэд. В.С. Цітова. – Мінск : БДПУ, 2003. – Кн. 2. – 122 с.
4. Логинов, К.К. Обряды традиционные / К.К. Логинов // Vottovaara. Портал людей знания [Электронный ресурс]. – 2005. – Режим доступа: http://www.vottovaara.ru/karelia/obrad/obrady.html. – Дата доступа: 26.05.2006.
5. Народная культура Беларусі : энцыкл. давед. / пад агул. рэд. В.С. Цітова. – Мінск : БелЭн, 2002. – 432 с.
6. Цітоў, В.С. Народная школа ў гісторыі нацыянальнай адукацыі / В.С. Цітоў // Народныя традыцыі і нацыянальная культура : Матэрыялы рэсп. навук.-практ. канф., Мінск, 6-7 снеж. 2001 г.: У 2 кн. / пад рэд. В.С. Цітова. – Мінск : БДПУ, 2003. – Кн. 2. – 122 с.

7. Чистов, К.В. К классификации обрядов жизненного цикла / К.В. Чистов // Язычество восточных славян. – Л.: Наука, 1990. – С. 101–107.

***Алесь Зайка***

## ПРА ПАХОДЖАННЕ ЛЮДЗЕЙ ПА-БЕЛАРУСКУ

Этыялагічныя легенды, паданні, міфы – маладаследаваныя жанры ў беларускай фальклярыстыцы. Верагодна, справа ў тым, што народныя ўяўленні пра паходжанне Сусвету, чалавека, жывёльнага і расліннага свету звязаны і з біблейскай, і з апакрыфічнай касмагоніяй. А вядома, што ўсякае праяўленне «рэлігійнасці» не віталася савецкай ідэалогіяй. Трэба толькі шкадаваць аб тым, колькі шэдэўраў чалавечага светапогляду, некалі змешчаных у фальклоры, праігнаравана ці фанатызмам, ці пагардаю, а найболей – людской нядбайнасцю. На жаль, і тое, і другое, і трэцяе мела месца ў нядаўнім мінулым. Апошнім часам, аднак, ідзе інтэнсіўны, сістэмны аналіз навукоўцамі міфатворчасці славянскіх народаў. Не станем пералічваць усе выданні, адзначым толькі найгрунтоўны «Мифологический словарь», выдадзены ў Маскве ў 1991 г. пад агульнай рэдакцыяй Е.М. Меляцінскага. У ім надзвычай сістэмна і паслядоўна выкладзены міфы не толькі славянскіх народаў, але і народаў усяго свету.

Тры гады таму назад, праглядаючы ўласны архіў, я натрапіў на этыялагічную легенду, міф, запісаны ў 1974 г. ад Марфы Захараўны Шчурко, 1907 г.н., жыхаркі в.Заполле Івацэвіцкага раёна. Яе антрапаганічны змест вымусіў мяне звярнуцца да вышэйназванага выдання, каб даведацца: ці сустракаецца падобны сюжэт у іншых народаў? Як не дзіўна, але міфа з такім сюжэтам у слоўніку я не знайшоў. Вось тэкст «нашага» міфа, «нашай» этыялагічнай легенды пра паходжанне чалавека.

***«Чаму на Зямлі добрыя і ўсякія людзі жывуць».*** *Даўней Адам жыў адзін. Бог рабрыну выняў у Адама, і ў Адама стала жонка. Хадзілі яны голыя, але пасля сталі сорам мець і пачалі адзежу шукаць. Выгадавалі яны сем сыноў і дачку. І кожны сын хацеў з ёю ажаніцца. Тады Адам кажа, каб яны зляпілі па гаршчэчку. Зляпілі сыны, абпалілі і прынеслі бацьку. Адам у першы гаршчэчок пасадзіў дачку, у другі – вядзьмедзіцу, у трэці – авечку, у чацвёрты – курыцу, у пяты – гусь, у шосты – качку і ў сёмы гаршчэчок – змяю. Прыйшлі сыны, і кожны ўзяў свой гаршчэчок, а ў гаршчэчку была кожнаму жонка. Хто ўзяў сабе за жонку дачку, то ад іх пайшлі добрыя і справядлівыя людзі. У каго за жонку стала вядзьмедзіца, то людзі ад іх суровыя, маўклівыя. Буркня слова і маўчыць. У каго курыца жонка – нічога не мелі ў гаспадарцы. Не збірая, а разграбая. А калі зробіць шчо, то ўсім пахваліцца. У каго авечка, тыя людзі спакойныя, разважлівыя, цярплівыя. У якого сына жонкай была качка – гэтыя людзі выйшлі рабочыя, заможныя, жылі ў дастатку, бо ўсё да горбы і да горбы збіралі. Яны могуць жыць адны і на балоці, і ў полі, і ўсюды ўсё мецьмуць. З гусі людзі былі вясёлыя, заўсёды рагочуць. Найгоршыя людзі былі са змяі: на адных падкусах ды абгаворах жылі, муцельстві. Хоча ўсяк пасварыць людзей. І будзя то там, то там языком малоць. Вось чаму на зямлі добрыя і ўсякія людзі жывуць.*

Тэкст аўтэнтычны, у ім захаваны асаблівасці мясцовага маўлення, характэрнага для баранавіцка-гродзенскіх гаворак. І зноў жа, каб упэўніцца ў арыгінальнасці міфа, мы ўважліва прагледзелі кнігі, якія давалі класіфікацыю сюжэтаў, пазначалі паказчыкі матываў. Гэта наступныя даследаванні: «Указатель сюжетов русских быличек и бывальщин о мифологических персонажах» С.Айвазяна; «Сучаснае бытаванне народнай неказкавай прозы: аспекты наратыва і дыскуса. Фальклярыстычныя даследаванні. Кантэст, тыпалогія, сувязі» А.Боганевай; «Былички и демонологические поверья (Живая старина)» Л.Вінаградавай; «Народная Библия»: восточнославянские этнологические легенды» складзеная В.Бяловай; «Легенды» і «Народное православие» А.Панчанкі; «Сказка и быличка (Мифологический персонаж в системе жанра)» І.Разумавай; «Сравнительный указатель сюжетов. Восточнославянская сказка»; «Традыцыйная мастацкая культура беларусаў», тамы «Брэсцкае Палессе» і «Гродзенскае Панямонне» і інш.

Звернемся да тэксту міфа. Вядома, што першыя адзінаццаць раздзелаў Кнігі Быцця Старога Запавету прысвечаны самаму пачатку светабудовы і чалавечай гісторыі. Наш Сусвет і ўсё, што ў ім: сонца, месяц, зямля і вада, птушкі, жывёлы – усё здзейснена па волі Божай. А вянцом Божага тварэння стаў чалавек, пакліканы для таго, каб клапаціцца пра сваё і цешыцца сумоўем з Богам. Гэтага чалавека звалі Адам, а жонку яго Ева. Яе Бог стварыў з рабрыны, узятай у Адама (Быццё, 2, 21–25). Адам нарадзіў сына Сіфа, а пасля, цераз доўгі прамежак часу, яшчэ «спарадзіў ён сыноў і дачок» (Быццё, 5, 3–5). Адзначым, што пачатак «нашага» міфа – гэта своеасаблівы пераказ біблейскай гісторыі пра паходжанне людзей. А вось далей назіраецца новы, арыгінальны паварот у развіцці сюжэту, ужо адрозны ад тэксту «Бібліі». І хоць на пачатку мы заўважаем матыў інцэста, кровазмяшэння (усе сямёра сыноў жадаюць узяць за жонку сваю сястру, і ўрэшце рэшт бацька жэніць аднаго сына з ёй), то пасля Адам жэніць сыноў з жывёламі, дзікімі і свойскімі (мядзьведзь, авечка), з птушкамі (курыца, качка, гусь) і з паўзуном (змяя). Ад гэтага шлюбу, згодна з міфам, і пайшлі людзі на зямлі. Усякія – і добрыя, і ліхія.

Калі чытаем «наш» тэкст, найперш кідаюцца ў вочы адзнакі дахрысціянскага бачання свету нашымі продкамі: знітаванне, зліццё чалавека з прыродай, пакланенне жывёлам-татэмам. Непадзельнасць, роднасць людзей з аб'ектамі жывой і нежывой прыроды напоўнена ўся шматвяковая гісторыя беларускага этнаса. Успомнім абрад пераапранання людзей у жывёл у час калядавання, на